# Пашыраючы гістарычныя гарызонты

**Пазнавальныя экскурсіі па гістарычных месцах Гродна і Гродзенскай вобласці праводзяць навучэнцы сярэдняй школы № 39 Гродна ў кабінеце гісторыі. Экспазіцыя "Мая Радзіма — Беларусь" і цікавы аповед юных экскурсаводаў дазваляюць шмат даведацца пра мінулае і сучаснае дойлідства краіны.**

Такая экспазіцыя з'явілася дзякуючы супрацоўніцтву школы і факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Больш за два гады тут працуе філіял кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Такое супрацоўніцтва карыснае і ўніверсітэту, і школе. Як адзначае загадчык кафедры Сяргей Аркадзьевіч Піваварчык, гэта садзейнічае практыка-арыентаванаму навучанню студэнтаў. У школе яны не толькі праходзяць практыку, тут штотыдзень адбываюцца заняткі.

— У асеннім семестры 2018/2019 навучальнага года мы ўпершыню адпрацавалі сістэмную мадэль падрыхтоўкі студэнтаў да выкладання ў школе, — расказвае С.А.Піваварчык. — Спачатку на базе філіяла яны праслухалі курс "Методыка выкладання гісторыі". Лекцыі чытала дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін С.У.Сілава, а практычныя заняткі правялі настаўнікі гісторыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Веды, атрыманыя ў рамках вывучэння курса "Методыка выкладання гісторыі", студэнты змаглі прымяніць на педагагічнай практыцы. Такая практыка навучання студэнтаў ажыццяўляецца і цяпер.

— Работа філіяла кафедры ў сярэдняй школе таксама ўключае ў сябе дзейнасць па навукова-метадычным суправаджэнні і кансультаванні навукова-даследчай дзейнасці педагогаў і навучэнцаў школы прафесарска-выкладчыцкім калектывам кафедры. Такі кірунак работы філіяла дазваляе павысіць якасць і матывацыю вучняў у правядзенні навукова-даследчай работы, ажыццяўляць падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для патрэб установы адукацыі, прыцягваць педагогаў і вучняў школы да навуковых мерапрыемстваў, што праводзяцца ва ўніверсітэце, — дадае дацэнт кафедры Алена Мікалаеўна Обухава, якая кіруе філіялам кафедры ў сярэдняй школе № 39.

Традыцыйнымі сталі сумесныя паходы студэнтаў і навучэнцаў напярэдадні Дня Перамогі "З лампадай Вечнага агню", удзел метадаб'яднання настаўнікаў гісторыі і старшакласнікаў школы ў навуковым форуме FIKIT_SCIENCE на факультэце гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ, у Каложскіх чытаннях, Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Гродзенская зямля на скрыжаванні народаў, культур і цывілізацый: мінулае і сучаснае".

— Наша школа знаходзіцца ў мікрараёне Альшанка. У правядзенні даследчай работы па тэме "Альшанка: Малая і Вялікая" нам вельмі дапамагаюць супрацоўнікі кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, — гаворыць дырэктар школы Аксана Анатольеўна Пятрова. — Разам мы арганізавалі для настаўнікаў сярэдніх школ Кастрычніцкага раёна Гродна метадычны семінар "Выкарыстанне музейнай экспазіцыі ўстаноў вышэйшай адукацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе сярэдніх школ". Нашы вучні ўдзельнічаюць разам з членамі ваенна-патрыятычнага клуба "Рубеж" ГрДУ ў дабрачыннай акцыі "Павіншуй ветэрана", іх запрашаюць на "Інтэлектуальныя серады" навуковага гуртка "НіКа".

Пашыраюць гістарычныя гарызонты школьнікаў і цікавыя мерапрыемствы, якія праводзяць навукоўцы кафедры. Так, доктар гістарычных навук С.А.Піваварчык правёў для навучэнцаў 7—9-х класаў вучэбныя заняткі "Археалогія Старога замка", пазнаёміў з гісторыяй археалагічных раскопак на тэрыторыі замка, пачынаючы з 30-х гадоў мінулага стагоддзя да цяперашняга часу. Убачылі дзеці ўнікальныя знаходкі — шахматныя фігуркі і шахматную дошку з дрэва, радавы знак князя Вітаўта на цэгле — "пальчатцы" XIV—XV стагоддзяў, узоры даспехаў воінаў XIII—XIV стагоддзяў — і прынялі ўдзел у інтэрактыўнай гульні "Рыцары эпохі Сярэдневякоўя". На занятках па гістарычным мадэляванні дзеці робяць макеты — паменшаныя копіі гістарычных і архітэктурных славутасцей Беларусі.




— У кабінеце гісторыі нашай школы прадстаўлены экспазіцыі "Сакральнае дойлідства", "Краіна замкаў", "Каралеўскае Гродна", "На памежжы культур", — расказвае настаўніца гісторыі сярэдняй школы № 39 Гродна Людміла Анатольеўна Стасюк. — Яны створаны дзякуючы рабоце філіяла кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Гэтая выстава не толькі дапамагае ў вучэбным працэсе. Нашы дзеці з гуртка юных гісторыкаў "Мая Альшанка" збіраюць гістарычны матэрыял, праводзяць экскурсіі для навучэнцаў і гасцей школы. Так, у нас пабывалі госці з Літвы і Славеніі. А экскурсіі дзеці праводзяць і на англійскай мове.

Даша Белуш асабліва любіць расказваць гасцям школы аб Каложы. Менавіта з гэтай славутасці пачынае юны экскурсавод расказ аб самых знакамітых помніках архітэктуры Гродна. Даша і яе аднакласнікі плануюць пашыраць веды аб гісторыі разам з настаўнікамі школы і выкладчыкамі ўніверсітэта.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@nastgaz.by*

**Фота аўтара.**